


**Д. ШАРУК**
бібліятэкар І катэгоры
Гатаўскай СБК

# “Зорка нацыянальнай паэзіі”

## Выставачная дзейнасць Гатаўскай сельскай бібліятэкі-клуба да 120-годдзя з дня нараджэння Язэпа Пушчы

***20 мая 1902 года ў невялічкай вёсачцы Каралішчавічы, што ў Мінскім павеце, у сялянскай сям'і нарадзіўся беларускі паэт, крытык, перакладчык Язэп Пушча (Ёсіф Паўлавіч Плашчынскі).***

Будучы навучэнцам Мінскага рэальнага вучылішча, Ёсіф знаёміцца з творчасцю Янкі Купалы, што паводле словаў самога Пушчы “абудзіла… нацыянальную свядомасць”.

Вядома ж, творы Янкі Купалы не могуць не ўразіць. Спрыяла, безумоўна, развіццю творчага патэнцыялу і месца, дзе нарадзіўся пісьменнік. Маляўнічая вёска, багатая сваёй гісторыяй, распрасціралa свае кроны на старым Ігуменскім тракце. Менавіта Ігуменскі тракт быў галоўнай дарогай у паўднёва-ўсходнім напрамку і звязваў Мінск з бліжэйшымі буйнымі мястэчкамі — Смілавічамі і Ігуменам. Каралішчавічы стаялі ўздоўж берага ракі Свіслач, якая захавала свае абрысы па сённяшні дзень. Спачатку вёска была маёнткам князёў Заслаўскіх, потым полацкіх князёў Друцкіх-Горскіх, пасля чаго перайшла да роду Прушынскіх.



Незвычайная прыгажосць родных мясцін, ахінутыя гісторыяй землі не маглі не пакінуць адбітку на станаўленні Я. Пушчы не толькі як паэта, але і як асобы. Калі прыязджаеш на гэтыя землі — адчуваеш іх унікальнасць.

Гатаўская сельская бібліятэка-клуб углублена вывычае гісторыю роднага краю. З нагоды 120-годдзя з дня нараджэння пісьменніка мы імкнемся засяродзіць увагу кожнага чытача на асобе Язэпа Пушчы. Гэта не толькі кніжныя выставы, дзе чытачы могуць пазнаёміцца з творчасцю пісьменніка. Мы заўсёды імкнемся ахапіць як мага больш інфармацыі і ў даступнай форме данесці яе да сваіх землякоў, асабліва да падрастаючага пакалення, якое прапусціць праз сябе хаця б невялічкую часцінку нашай працы і, спадзяемся, пранясе яе па жыцці…

Каб прыцягнуць увагу да выставы, імкнемся да маляўнічасці, выкарыстоўваючы не толькі сродкі камп'ютарнай графікі, але і працу “пэндзля і фарбаў”, што надае самабытнасць і выразнасць экспазіцыі ў цэлым.

Не забываем мы таксама і пра друкаваную прадукцыю: бюлетэні, буклеты, кішэнныя каляндарыкі, закладкі, якая мае высокі попыт сярод наведвальнікаў выставы.

Выязджаем з выставамі на адкрытыя мерапрыемствы раённага і абласнога маштабу.

Галоўная мэта — прыцягнуць увагу чытача, уразіць яго, вырашыць не толькі інфармацыйныя задачы, але і забяспечыць у комплексе дасягненне мэты сваёй працы ў працэсе апасродкаванага вобразнага дыялогу з чытачом.

*На фота ( застаўка ) работнікі Гатаўскай сельскай бібліятэкі-клуба з выставай на выязным раённым мерапрыемстве, прысвечаным Дню бібліятэк*